**337.** Запішыце сказы, утвараючы ад слоў і словазлучэнняў, што ў дужках, складаныя прыметнікі і дапасоўваючы іх да назоўнікаў. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары.

1. Нарэшце за Ждановічамі выехалі на новую *(чатыры паласы)* трасу, і машына пабегла в..сялей *(З. Прыгодзіч)*. 2. Гэты слабы пах струменяць дробныя *(бледны, ружовы)* кветачкі, падобныя да зв..ночкаў *(Х. Гурыновіч)*. 3. Усяго *(старажытныя славяне)* летапісы* і крыніцы дакладна называюць на тэр..ыторыі сучаснай Беларусі 35 г..радоў, якія сён..я вывучаны і даследаваны *(Я. Сіпакоў)*. 4. Ак..ян заварожваў сваёй бяздон..ай[с], *(празрысты, сіні)* гл..бінёй *(П. Саковіч)*.

## § 55. Правапіс *не (ня)* з прыметнікамі

**338.** Абапіраючыся на прыклады, успомніце правіла напісання ***не (ня)*** з назоўнікамі.

1. Недахоп, незабудка, нянавісць.
2. Непрыяцель — вораг; няволя — прыгнёт.
3. Не ласка, а злосць; не праўда, а хлусня.

Прачытайце прыклады. У якіх выпадках ***не*** пішацца з прыметнікамі разам, а ў якіх — асобна?

| | |
|---|---|
| небагаты чалавек — бедны чалавек | не багаты, ***а*** бедны чалавек |
| невялікая пляцоўка — малая пляцоўка | не вялікая, ***а*** малая пляцоўка |
| нескладанае заданне — простае заданне | не складанае, ***а*** простае заданне |

- Як называюцца пары слоў тыпу *небагаты — бедны*; *багаты — бедны*?

***Не (ня)*** з прыметнікамі пішацца разам:
- калі прыметнік не ўжываецца без ***не (ня)***: *непахісны, няспынны*;
- калі прыметнік можна замяніць сінонімам без прыстаўкі ***не- (ня-)***: *невялікі (малы), няправільны (памылковы)*.



Правообладатель Национальный институт образования

***Не*** з прыметнікамі пішацца асобна:

- калі ёсць ці падразумяваецца супрацьпастаўленне: *не шырокі, **а** вузкі пояс*;
- калі з прыметнікамі ўжываюцца словы ***далёка не, зусім не, нікольні не, нічуць не***: *нікольні не цікавы, нічуць не салодкі.*

**339.** Да прыметнікаў з левага слупка падбярыце сінонімы з правага слупка. Запішыце прыметнікі парамі, раскрываючы дужкі.

| | |
|---|---|
| вялікі, маўклівы, танны, слабы, лянівы, унікальны, гаротны, зменлівы | *(не/ня)*гаваркі, *(не/ня)*шчаслівы, *(не/ня)*дарагі, *(не/ня)*дбалы, *(не/ня)*абсяжны, *(не/ня)*ўстойлівы, *(не/ня)*моглы, *(не/ня)*звычайны |

З дзвюма парамі прыметнікаў (на выбар) складзіце і запішыце сказы са злучнікам ***а***, у якіх ***не*** з прыметнікам пішацца асобна.

**340.** Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя прыметнікі з прыстаўкай ***не- (ня-)*** у патрэбнай склонавай форме.

| | |
|---|---|
| 1) птушка ... палёту; | а) ‘даволі складаная праблема’; |
| 2) ... сіла прынесла; | б) ‘у прыгнечаным настроі, з неспакоем’; |
| 3) з ... сэрцам; | в) ‘нязначны, малаважны чалавек’; |
| 4) задача з многімі ... . | г) ‘хто-небудзь недарэчы, не ў пару прыходзіць, з’яўляецца’. |

Для даведкі: *(не/ня)лёгкі, (не/ня)высокі, (не/ня)вядомы, (не/ня)чысты.*

Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі. З двума фразеалагізмамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

**341.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Якую ролю ў тэкстах гэтага тыпу выконваюць прыметнікі?

Вёска Шва́кшты **малая** — крыху большая за пяцьдзясят дв..роў. І вуліц небагата — дзве з п..ловаю. Адна з іх даўняя, **вузкая**, са старымі драўлян..ымі хатамі. Другая, што ідзе паралельна гэтай, новая, шырокая, з прыгожымі цаглян..ымі[м] д..мамі,



Правообладатель Национальный институт образования

ак..уратнымі **нізкімі** пл..тамі. І трэцяя, якая злучае гэтыя дзве, **кароткая** — яе сапраўднай вуліцай і назваць нельга *(Паводле З. Прыгодзіча)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і замяняючы выдзеленыя прыметнікі сінонімамі з прыстаўкай ***не- (ня-)***. Растлумачце лексічныя значэнні слова *плот* у беларускай і рускай мовах.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Што абазначае прыметнік як часціна мовы?
2. На якія разрады падзяляюцца прыметнікі паводле значэння і граматычных прымет? Прывядзіце прыклады пераходу адносных і прыналежных прыметнікаў у якасныя.
3. Якія ступені параўнання могуць мець якасныя прыметнікі?
4. Пры дапамозе якіх суфіксаў утвараюцца прыналежныя прыметнікі ад назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду? Прывядзіце прыклады.
5. Назавіце асноўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў.

**342.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Колькі ў тэксце падтэм?

Настаўніца ўзняла смычок, і палілася павольная музыка.[сн]

Музыка ахутвала кожнага пяшчотн.., чароўн.. покрывам, выклікала ў душы маляўніч.. карціны. Аднаму бачылася, як бруяцца на сонцы струмені празрыст.. крынічн.. вады. Другому чулася, як шумяць вярша́лінамі зялён.. дубровы. Трэцяя ўяўляла, як танцуе на вялік.. квяціст.. лузе, а наўкол у такт музыцы ківаюць галоўкамі кветкі. Чацвёртаму здавалася, што ён бяжыць па неабсяжн.. полі, на якім каласіцца залат.. жыта. Душа пятага ляцела ў высок.. сін..-сін.. небе сярод бел..-бел.. аблокаў.

І толькі Віцька, які заткнуў вушы, быў упэўнены, што наўкол разносяцца гукі, падобныя да рыпення старых дзвярэй. Проста над Віцькавай кватэрай жыла дзяўчынка, якая нядаўна пачала вучыцца іграць на скрыпцы. І яе музыка нагадвала хлопчыку якраз такія гукі. Штодзённыя заняткі маленькай скрыпа́чкі сталі для Віцькі пакутай* *(Паводле Т. Бунта)*.

Вызначце лексіка-граматычныя разрады ўжытых у другім абзацы прыметнікаў. Прывядзіце прыклад пераходу адноснага прыметніка ў якасны.



Правообладатель Национальный институт образования

Спішыце другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя канчаткі прыметнікаў.

● Якую ролю выконвае націск у словах *му́зыка — музы́ка, скры́пачка — скрыпа́чка*?

**343.** Складзіце слоўнікавы дыктант (15—20 слоў) на тэму «Правапіс прыметнікаў», уключыўшы ў яго прыметнікі з вывучанымі арфаграмамі. Прадыктуйце прыметнікі свайму аднакласніку. Запішыце пад дыктоўку прыметнікі, падабраныя ім. Выканайце ўзаемаправерку.

**344.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

## Краіна цукерак і дзяцінства

Адны з самых смачных салодкіх прысмакаў* у Беларусі робяць на **гомельскай** фабрыцы «Спартак».

Здаецца, няма ў свеце чалавека, які б не частаваўся цукеркай «Залаты ключык». Гэтыя ірыскі былі вельмі папулярныя ў нашых бабуль і дзядуляў. Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя за восем гадзін спецыяльная машына-аўтамат магла вырабіць пяцьсот кілаграмаў такіх цукерак!

Сёння прадпрыемства штомесяц выпускае два мільёны кілаграмаў цукерак, карамелі, шакаладу і вафляў. Галоўнае месца на «Спартаку» займае вытворчасць шакаладу і **шакаладных** цукерак. Пакаштаваць іх амаль праз некалькі хвілін пасля выпуску, а таксама паласавацца гарачым духмяным шакаладам можна ў **фірменным** кафэ на фабрыцы.

Калі будзеце ў Гомелі, завітайце на «Спартак», каб апынуцца ў чароўнай краіне цукерак і дзяцінства! *(Паводле І. Зімневай).*

Складзіце і запішыце план тэксту. Выпішыце з тэксту апорныя словы (прыметнікі), якія адпавядаюць кожнаму пункту плана. Карыстаючыся планам і апорнымі словамі, вусна перакажыце тэкст.

Знайдзіце ў тэксце прыметнік, ужыты ў форме ступені параўнання. Зрабіце яго марфалагічны разбор.

Вызначце спосаб утварэння выдзеленых прыметнікаў. Да якога лексіка-граматычнага разраду яны адносяцца?

**345.** Выканайце тэматычную тэставую работу па раздзеле «Прыметнік».



Правообладатель Национальный институт образования